*Галіна Іосіфаўна Лазіцкая*

# Пачуццё страты

*Палеская сталіца,*
*Квітнеючы і старажытны Пінск.*
*У ім жыла жанчына-таямніца,*
*Недасягальная, нібы чароўны сфінкс.*
*Па Першамайскай, вы акіньце вокам,*
*136-ы, вунь — высокі дом.*
*Загадка ж тая — Валянціна Локун,*
*З сівой матуляю і братачкам-крылом.*

Весці расповед пра Валянціну Іванаўну для мяне ў радасць, як бы не заходзілася сэрца ад жалю.

А жаль вызваны толькі адным пачуццём — стратай. Не паспеўшы насыціцца гэтым знаёмствам, трэба развітацца назаўсёды. Чаму кажу насыціцца… У першы ж дзень знаёмства Валянціна Іванаўна выклікала прыхільнасць да сябе прастатой зносін. Ведаючы яе заслугі і дасягненні ў галіне літаратуры, я сумелася ад даступнасці размовы, бо яна з першага дня жыва зацікавілася маёй творчасцю. Я на той момант не зусім дасканала валодала пяром, бо да творчасці прыйшла ў сталым узросце і вельмі бянтэжылася з гэтай прычыны. Але цікавасць Валянціны Іванаўны да маіх намаганняў не была павярхоўнай ці насмешлівай. Размова нароўні і талковыя парады напаўнялі маю душу заспакаеннем і жаданнем больш упэўнена шукаць сябе ў новай справе. Гэта — першы немалаважны плюс для мяне ад знаёмства.

Другі плюс — брат і матуля Валянціны Іванаўны. У маіх вачах яны выраслі героямі вялікіх памераў, бо іх штодзённасць — прыстасаванне і змагарства з абставінамі жыцця. Брат Васіль Іванавіч, таксама цяжка хворы, але заўсёды «нястомны мураш», правая рука сястры — усе яе работы, напісаныя ад рукі, набіраліся ім на камп'ютары, што паскарала выкананне навуковых работ і выданне кніг. А выконваць такую працу ў яго стане, скажу шчыра, ой, як складана! А мама, Ева Аляксандраўна, якую я застала яшчэ жывой, без усякіх пафасных слоў — яскравы прыклад трываласці лёсу з малітоўнай падзякай да Бога за разумных дзяцей. Нават тады, калі яе жыццё ўжо ішло на часы, вусны ўсё роўна шапталі малітвы. Прызнацца, такую малітоўніцу я сустрэла ўпершыню… Адчувала я сябе з імі так проста і звычайна, нібы пераступала парог бацькоўскай хаты.

Па-трэцяе, дый на ўсё астатняе таксама, што моцна ўражвала мяне падчас майго знаходжання ў кватэры сям'і Локун, дык гэта кола іх сяброў. Розныя па прафесіях, інтарэсах, узросту, жыццёвых прыступках, яшчэ немалаважна — характарах. Валянціна Іванаўна адносілася да кожнага з іх па ўзроўні і інтэлекце, да стану кожнай чалавечай душы, аб'ядноўвала ўсіх нас памяркоўнай чуллівасцю. Думаю, што не памылюся, калі скажу, што тое ж самае падкрэсляць і яе сябры.

Адчуванне роўнасці, паразумення, падтрымкі, разумнай дарады прыцягвалі да яе, як да роднай матулі. Мы цягнуліся да яе, як аблудныя авечкі, неслі да яе свае праблемы, шукалі ў яе — нямоглай — разрадкі, спагады, падказкі. І яна ў такія часы даверу брала на сябе нялёгкую ношу — станавілася нашым мірскім духоўнікам.

У духоўнікаў ёсць прыгожае слова (у рускім вымаўленні) — «окормление». Падчас такіх гутарак Валянціна Іванаўна акармляла нас невычарпальнай скарбніцай мудрых парад, што падчас рабілася нават сорамна за свае скаргі на лёс.

І пакрысе наш унутраны свет аднаўляўся, напаўняў нас новымі сіламі. Нас, дарослых, самастойных, упэўненых у сабе, і што немалаважна ў адносінах да яе, скажам так, на сваіх нагах!

Валянціна Іванаўна заўсёды будзе перад маімі вачыма яскравым прыкладам паводзін, бо яны ўзнялі яе над цялеснай нямогласцю, прыносячы і ў такім стане немалую карысць людзям. Гледзячы на яе малярухомую, але прыгожую, добразычлівую, я не стрымлівалася ад кампліментаў. Казала: «Валянціна Іванаўна, даражэнькая! Ад Вас зыходзіць жыватворнае святло, якім Вы бескарысна саграваеце сваё акружэнне. Вам абавязкова будзе асаблівы вянец ад Госпада»… А яна ўзамен вельмі цёпла, амаль какетліва ўсміхалася.

Што тычыцца мяне, дык я бясконца ўдзячна лёсу за тое, што прывёў мяне да цудоўнай, у маіх вачах — непараўнанай жанчыны, даў магчымасць служыць Валянціне Іванаўне Локун, якая яркай каметай пакінула ў маёй душы глыбокі след.

*г. Пінск, жнівень 2019 г.*